## ВАЙНА – ГЭТА МАСТАЦТВА?[1]

**Пётр Новак**[2]

**Abstract**

In his essay, Piotr Nowak analyzes N. Machiavelli's not very well-known treatise "The Art of War" which one can consider as a theoretical generalization of his particular experience. However, contrary to what the title of book might hint, it is the least Machiavellian work. In comparison to the whole body of Machiavellian corps of texts, this one is considered as an example of opportunism and even cowardice of its author. The ruthless advice to the Prince is replaced with technical arguments by a condottiere, who seeks, above all, "to minimize his own losses." The War – as Machiavelli insists – should stay at war and would not be applied to peacetime; while the desire to win, to explore – the key theme of "The Prince" and "The Discourses on Livy" – are left out this time.

**Keywords**: Machiavelli, the art of war, the moral in war, war values.

Марпехі не паміраюць –
яны ідуць да д'ябла на перагрупоўку.
*Надпіс на майцы амерыканскага спецназаўца*

«Вельмі кароткія ўводзіны ў Макіявелі» Квенціна Скінера пачынаюцца з цудоўнага анекдота. Яго герой – Генры Кісінджар, зняслаўлены амерыканскі дыпламат, які ў 60-х і 70-х гадах мінулага стагоддзя лічыўся галоўным архітэктарам замежнай палітыкі Злучаных Штатаў. На пытанне карэспандэнта The New Republic, ці кіраваўся ён калі-небудзь у сваіх палітычных праектах парадамі Макіявелі, стваральнік сучаснай дактрыны палітычнага рэалізму адказаў: «Ды дзе там! Ніколі!»[3] Калі сёння такія заявы выклікаюць у нас пэўную весялосць, то хіба таму, што нават дзіця ведае простую рэч: эфектыўнасць дзейнасці залежыць ад бізуна, перніка і ступені засваення асноў «Уладара». Кожны палітык, прызнаецца ён у гэтым ці не, карыстаецца гэтымі ведамі ў прафесійнай дзейнасці – незалежна ад таго, падгледзеў ён гэта ў калегі або сам прачытаў у Макіявелі. Іншымі словамі, палітык – а разам з ім міжволі і простыя людзі – штодзень дыхае паветрам

---

[1] Пераклад з польскай Т. Врублеўскай-Токер.

[2] Пётр Новак– доктар філасофіі, габілітаваны, прафесар філасофіі ўніверсітэта Беластока (Беласток, Польшча).

[3] Q. Skinner: *Machiavelli. A Very Short Introduction*, Oxford 1981, 1–2.

«Уладара». А генералы? Што яны думаюць пра Макіявелі? Што мяркуюць пра яго тыя, каго развітыя дэмакратыі пасылаюць на вайну з думкай аб упарадкаванні перыферыі свету, кандацьеры, якія штодзень звяртаюцца да сродкаў гвалту, да беспасярэдняга прымусу? Тут сітуацыя, здаецца, больш складаная.

Мала хто памятае, што аўтар «Развағ над першымі дзесяццю кнігамі Тыта Лівія» аб гісторыі Рыма быў не толькі выбітным мысляром і пісьменнікам, прыроджаным дыпламатам, чалавекам, які любіў жыццё, але таксама і стваральнікам аддзяленняў фларэнтыйскай муніцыпальнай міліцыі. Таму трактат Макіявелі «Аб мастацтве вайны» можна – а магчыма, і неабходна – прызнаць тэарэтычным абагульненнем ягонага самага сапраўднага, канкрэтнага досведу. Насуперак таму, на што магла б намякаць сама назва, гэтая кніжка ўяўляе сабой найменш макіявелеўскі твор. На фоне ўсёй творчасці ён, больш за тое, лічыцца прыкладам апартунізму і нават маладушнасці аўтара. У ім зашмат калькуляцыі, асцярожнага хаджэння кругом ды наўкола. У адрозненні ад іншых прац, у якіх Макіявелі рашуча бярэцца за праціўніка – перад усім за хрысціянскую мараль – тут ён наносіць удары з другой лініі. Бязлітасныя парады ўладару ён замяняе тэхнічнымі развагамі кандацьера Фабрыцыа, якому патрэбна перадусім «мінімізаваць уласныя страты». І ў VI кнізе мы чытаем аб трыццаці трох хітрасцях, якія павінен ведаць кожны камандзір; у VII кнізе яны дапаўняюцца спосабамі падыходу да крэпасці пры аблозе – і гэта, уласна, усё, канец, больш нічога. Гэтыя фрагменты – адзіныя, якія можна, ад бяды, лічыць макіявелеўскімі. Вайна – настойвае Макіявелі – павінна быць на вайне і не павінна распаўсюджвацца на мірны час; імкненне заваёўваць, здабываць – ключавыя тэмы «Уладара» і «Развағ» – на гэты раз ён абыходзіць маўчаннем.

«Аб мастацтве вайны» – гэта своеасаблівая разынка, адзіны досыць вялікі твор, які Макіявелі апублікаваў пры жыцці, акурат у жніўні 1521 года. Чаму ён выбраў менавіта гэтую кнігу, а іншыя – значна больш прывабныя і важныя – абмінуў? Здаецца, за рашэннем аб публікацыі гэтага твора магло стаяць жаданне вырашыць якія-небудзь пільныя справы, напрыклад, палепшыць бяспеку ў публічнай сферы. Затое іншыя творы, дзякуючы якім яго прозвішча стала ў хуткім часе шырока вядомым, ён часова асудзіў на маўчанне з прычыны свайго непахіснага стаўлення да хрысціянскай рэлігіі. Большасць каментатараў падзяляе думку, што такім чынам пісьменнік хацеў пазбегнуць абвінавачванняў у амаральнасці і нападзе на рэлігійныя вераванні. У рэшце рэшт яшчэ ў трэчэнта, эпоху, якая непасрэдна папярэднічае ўласна Рэнесансу, палітыка еўрапейскіх дзяржаў была падпарадкавана запавету выратавання[4].

Трактат Макіявелі выкладзены паводле платонаўскай формулы філасофскага дыялогу. Знаўцам прадмету выступае фларэнтыйскі наймiт Фабрыцыа Калона, а ягоныя сябры і ўдзельнікі дыскусіі –

[4] P. Manent: *Intelektualna historia liberalizmu*, Przeł. M. Miszalski, Kraków 1994, 21.

рэальныя гістарычныя асобы, прадстаўнікі маладой гарадской інтэлігенцыі, і з вайсковай службай у іх не шмат супольнага. Для іх вайна – тэма цікавай размовы, добрая, як і любая іншая. Сама размова адбываецца ў ваколіцах Фларэнцыі, у садах Ручэлаі (Orti Oricelellari), якія належаць Казіма Ручэлаі, аднаму з герояў твора. Макіявелі, як і Платон у сваіх дыялогах, не бярэ ў ёй актыўнага ўдзелу. Ён сядзіць убаку, сочыць, часам занатоўвае. Аб ягонай прысутнасці мы даведваемся з прадмовы, якую ён сам напісаў да гэтага твора і ў якой патлумачыў, што не ўдзельнічае ў спрэчцы таму, што не хоча ўставаць на чый-небудзь бок. Тым не менш ад пачатку зразумела, што ад яго асобы прамаўляе Фабрыцыа Калона: тое, аб чым кажа Фабрыцыа, атрымлівае амаль імгненнае ўхваленне аўтара. І наадварот, думкі Макіявелі аб вядзенні ваенных дзеянняў высока ацэньваюцца і пазіцыя героя не абцяжарваецца магчымымі памылкамі, якіх ён слушна сцеражэцца[5].

Фабрыцыа Калона выступае ў гэтай кнізе не толькі як «сабака вайны», «генерал». Ён узносіць хвалу рэспубліцы і ў той жа час ставіцца з павагай да сілы Уладара і аўтарытэту Царквы. Ён выведзены ў ёй як рэнесансны гуманіст, які на кожным кроку звяртаецца да адвечных правілаў і свежых прыкладаў. Вяртанне да продкаў, паўтарае ён, як сапраўдны спосаб аднаўлення годнасці дзяржавы, патрабуе далёкасяжных змен характару і паводзін усіх людзей, ледзь не землятрусу ў галіне нораваў у шырокім сэнсе. Аднак замест таго, каб пераймаць у вялікіх продкаў іх цвёрдасць і строгасць, у большасці выпадкаў капіруюць – на шчасце, рэдка – іх распешчанасць. У словах Калоны чуецца скарга самога Макіявелі, які ў сваіх «Развагах» шматкроць зласліва заўважаў, што прыкладам продкаў кіруюцца ва ўсім, толькі не ў палітыцы. Заўвагу аб распешчанасці сваіх сучаснікаў ён дапаўняе цудоўнай карцінай іх раскошы ў ценю старадаўніх дрэваў, якія і сёння даюць нам бяспечную ахову ад сонца.

«Калі мы прыйшлі туды, частка з іх села на траву, асабліва свежую ў тым месцы, частка на лавы, што стаялі ў ценю высокіх дрэваў, а Фабрыцыа азваўся аб гэтым закутку як аб крыніцы неверагоднай асалоды; ён пачаў уважліва разглядаць дрэвы, але ніводнага з іх не распазнаў і, здаецца, быў моцна ўражаны гэтым. Казіма заўважыў гэта і сказаў: “*Signore*, вы, можа быць, не ведаеце некаторыя з гэтых дрэў, але не здзіўляйцеся, таму што тут ёсць некалькі гатункаў, якія цаніліся продкамі, хоць сёння іх ужо і не садзяць паўсюль”. Пасля ён расказаў Фабрыцыа, як яны называюцца і колькі працы ўклаў яго дзед Бернарда ў дагляд за імі. Фабрыцыа адказаў: “Я падумаў, што менавіта так яно і было, а вашыя словы аб доглядзе за дрэвамі і само гэтае месца наводзяць мяне на ўспамін аб пэўных уладарах Каралеўства [Неапаль], якія знаходзілі прыемнасць у доглядзе за старажытнымі гатункамі дрэваў і цешыліся іх ценем (…) Наколькі б лепш зрабілі яны, калі б імкнуліся быць падобнымі да продкаў у

[5] H.C. Mansfield: An Introduction to Machiavelli’s Art of War, in: H.C. Mansfield, *Machiavelli’s Virtue*, Chicago-London 1998, 195.

сіле і строгасці, а не ў распешчанасці і задавальненнях, ва ўчынках, якія робяць на яркім сонцы, а не ў ценю, калі б яны, у рэшце рэшт, пераймалі ўзоры справядлівасці сапраўднай і дасканалай, а не фальшывай і сапсаванай"»[6].

Для Платона сонца было мэтай і адначасова прычынай для выхаду з цемры пячоры – да праўды існавання. Гэтая метафорыка добра вядомая Фабрыцыа, і ў сонцы ён бачыць адно толькі сродак выкоўвання характару, загартоўкі салдацкага жыцця – таму што ў ягоным бляску і жары выпякаецца мужчынская цнота. Яна вучыць, як абыходзіцца без «сектаў» – роўна рэлігіі і філасофіі, – узнагароджвае заслугі, перасцерагае ад пагарды тымі, хто бяднейшы за цябе, загадвае шанаваць звычаі, пацверджаныя іх доўгатрываласцю, і вайсковую дысцыпліну, а таксама ставіць агульнае дабро вышэй за ўласныя інтарэсы. Ад продкаў мы павінны вучыцца палітыцы, заснаванай на мастацтве вайны, а не на філасофіі, якая паслабляе волю да дзеянняў; і больш чытаць Палібія і Фукідыда, чым Платона і ягоных італьянскіх клакёраў тыпу Піка або Фічына; групаваць рымскія легіёны, македонскія фалангі, а не ствараць акадэміі і ліцэі. Зместам цноты Новага часу павінна быць самаабмежаванне на карысць дзяржавы або больш шырока: палітычнай супольнасці, што грэкі замацоўвалі інстытуцыйна, уводзячы ў мову палітыкі катэгорыю астракізму ў дачыненні да людзей, роўных багам або жывёлам. Іншымі словамі, Фабрыцыа выносіць на абмеркаванне сваім маладым суразмоўцам праграму «грамадзянскага гуманізму», спрытна змешваючы маральную цноту з урокам патрыятызму[7].

Леанарда Бруні, айцец рэнесанснай гістарыяграфіі, аўтар Historiarum Florentinarum (1442) і трактату De militia (1450) апісаў вайну як агон. У ягоным прачытанні яна аказваецца хутчэй зручным выпадкам праявіць сябе, падставай для гераічных учынкаў, чым для здабыцця новых земляў і падпарадкавання слабейшых. «Замест таго, каб разумець цноту як інструмент уласна вайны, Бруні разглядае вайну як арэну цноты»[8], і мімаходам ён акцэнтуе вельмі важную розніцу паміж гвалтам знішчальным і паказным, відовішчным. Мэта вайны гэта не, скажам так, імкненне да анігіляцыі праціўніка; мэта вайны – праявіць сябе, выдзеліцца, прадэманстраваць цноту роўным сабе. У адрозненне ад Бруні, Макіявелі разумее мастацтва вядзення вайны «тэхнічна», то-бок абсалютна амаральна. Перш за ўсё вайна – гэта не месца для сантыментаў, асабліва калі мэты задаюцца, нярэдка выпадкова, магчымасцямі войска і кампетэнцыямі камандавання. На вайне няма часу для рэалізацыі грамадзянскіх ідэалаў. Таму мастацтва яе вядзення з вялікай цяжкасцю ўдаецца ўзгадніць з грамадзянскім або іншым гуманізмам; гэта звычайна асобныя светы. Пры гэтым нельга трапляць у іншую крайнасць і сцвярджаць, што яе сэнс зводзіцца да механічнага перасоўвання

6 N. Machiavelli: *O sztuce wojny*, Przeł. A. Szopińska, Warszawa 2008, 20–21.
7 Mansfield, op. cit., 197.
8 Ibid., 197

цел, перагрупоўкі сіл, падліку забітых. Вайна застаецца палітыкай, але з той розніцай, што палітыку робяць іншымі сродкамі. Распаўсюджванне трактату «Аб мастацтве вайны» на сферу палітыкі прывяло да таго, што ён увабраў яе ў сабе. Вайна, якая вядзецца больш або менш крывавымі сродкамі, уласна, не згасае ніколі: мір – гэта ілюзія. Дзякуючы гэтаму назіранню Макіявелі дамогся поўнай свабоды ў дачыненні да іншых сфер грамадскага жыцця, ён абстрагаваўся ад маралі, ад пялегаванай традыцыі і ўсіх іншых мірных анахранізмаў.

Паколькі мастацтва вайны прадугледжвае майстэрства адрозніваць сяброў ад ворагаў, разважае адзін з суразмоўцаў Калоны, яно разам з тым з'яўляецца – або прынамсі магло б быць – добрым жыццём, сутнасць якога трымаецца на добрай арыентацыі ў жыцці. У сувязі з гэтым паўстае шэраг пытанняў: ці застаюцца «сабакі вайны» «добрымі людзьмі» ў мірны час? Калі яны не змогуць даць з гэтым рады, то ў чым сэнс выйгрышу, які раскрывае сапсаванасць і цынізм пераможцаў? І ўсё ж на вайне няма месца рэфлексіі, таму што «чыста мілітарны пункт гледжання страчвае сваю выразнасць у шэрагу сумневаў і няпэўнасцяў, якімі жывіцца філасофія»[9]. Макіявелі, калі выстаўляе гэтыя скептычныя заўвагі супраць войска наймітаў, раскрывае прынцыповы недахоп той вайсковай фармацыі, якая захоўвае лаяльнасць да тых, хто заплаціць больш. Такім чынам, пытанне аб умовах міру становіцца пытаннем аб улагоджванні наймітаў, то-бок аб тым, як пераўтварыць салдатаў у цывільных, якімі яны пагарджаюць. Самай вялікай вартасцю войска – але войска, сфармаванага прызывам, – аказваецца жаданне вярнуцца да мірных заняткаў, у той час калі прафесійныя салдаты, якія дзейнічаюць ва ўмовах эскалацыі канфлікту, міру не хочуць. Продкі таксама былі перакананыя ў ваеннай і маральнай высокасці тых, хто бароніць сваю зямлю з любові да яе, а не за грошы. Сапраўдная барацьба, паўтарае шмат разоў Калона, – гэта вялікая справа, калі стаўкай у ёй з'яўляецца слава пераможцы і дабро айчыны.

Макіявелі – стваральнік дактрыны, у якой даводзіў, што ўсе людзі кіруюцца аднолькава нізкімі памкненнямі, – запусціў лавіну паслядоўнікаў. Прыхільнікамі пазіцыі аб роўным статусе ўсіх народаў – меншых і большых – былі два тэарэтыкі права і дыпламаты Гуга Гроцыюс і Самюэль Пуфэндорф. Ні адна дзяржава на міжнароднай арэне не з'яўляецца адрознай сутнасцю, сцвярджалі яны, у той жа час кожная з іх мае права на самавызначэнне і суверэннасць (абмежаваную, тым не менш, суверэннасцю іншых дзяржаў). Гэтая канцэпцыя, дапоўненая ідэяй аддзеленасці грамадзянскай сферы ад ваеннай, прывяла да фатальных рашэнняў. У аснове самага значнага з іх ляжыць апрыёрная адмова ад ідэі нападу на іншую дзяржаву. А чаму, уласна, гэта забаронена? Што з'яўляецца падставай такога рашэння? Кожны ж ведае, што ёсць войны, якія карыстаюцца папулярнасцю, і ёсць зусім не папулярныя; і што войны вядуцца ў сваім

[9] Ibid., 200.

доме і за яго межамі. Далей войны падзяляюцца на справядлівыя і несправядлівыя, захопніцкія і абарончыя. І таму падобнае. Кожная з гэтых войнаў баліць інакш ці яны баляць аднолькава? Справа не ў тым, што адна вайна прыносіць больш пакут у адрозненне ад іншай. Гэтага нельга вымераць. Гаворка аб тым, што пацыфісты – прыхільнікі свету, вольнага ад канфліктаў, – не могуць зразумець феномену апраўданай вайны; у той жа ступені яны не разумеюць агрэсіі, накіраванай супраць іх саміх. «Народы, якія не разумеюць, што можа ўзнікнуць спакуса нападу, як правіла, сутыкаюцца з неспадзяваным нападам іншых, адчуваюць цяжкасці з яго адпаведным прызнаннем і арганізацыяй супраціву»[10]. У імя міру вывучаюць мастацтва вайны, кіруюцца законамі, якімі немагчыма пагарджаць, таму што ў адваротным выпадку дынаміка агрэсіі саштурхне вайну ў кірунку масавых злачынстваў.

Філосафам, звязаным з традыцыяй Асветніцтва, такім як Кандарсэ, вайна здавалася чымсьці анахранічным. Дакладней, яны перараконвалі, што вайна ўкараняе ў людзях забабонныя, атавістычныя паводзіны, адным словам, яна спрашчае свет і звязана з чалавечым глупствам. Макіявелі даводзіў, што вайна можа быць мастацтвам, а таксама, аб чым рэдка ўзгадваюць, што яна служыць вынаходлівасці і гаспадарчаму росту, выхоўвае цноту, спрыяе смеласці і здагадлівасці (траянскі конь!). Скажам проста: калі б не тэрміновая патрэба латаць мундзіры, хутчэй за ўсё, швейную машыну не вынайшлі б ніколі…

Макіявелі ўсведамляў, што ўласна антычнай цноты ў новых умовах нельга дасягнуць – яна не развіваецца, бо для яе няма дастаткова месца, адпаведнай прасторы для годных паводзін. Адначасова складана сказаць, ці быў ён апалагетам вайны, або толькі яе тэарэтыкам. Хутчэй за ўсё, ён лічыў, што ў далёкай перспектыве яе нельга ўнікнуць, калі чалавек так моцна прагне яе. Таму Макіявелі імкнуўся цывілізаваць вайну, задаць межы, узяць яе ў адпаведныя цуглі.

«Аб мастацтве вайны» – кніга павучальная, асабліва карысная ў нашыя дзіўныя часы, калі ніхто не верыць у магчымасць вайны, тым больш у яе цывілізаванае вядзенне. Да невідавочнасці вайны мы прызвычайваемся з дапамогай тэлевізійнага вяшчання і дзякуючы камп'ютарным гульням. Калі мы маем у распараджэнні па некалькі жыццяў, мы падмацоўваем адчуванне ўзнаўляльнасці існавання. Мы блытаем дзейнасць паліцыі з ваенным умяшальніцтвам, і наадварот. Жыццё ў сненні прыводзіць да заняпаду нашых ахоўных інстынктаў, а таксама скажае пачуццё рэальнасці – мы бачым сны аб тым, наколькі свет любіць нас, або аб тым, што ўсе – без розніцы – да нас вельмі прыхільныя, і іншыя падобныя байкі. Макіявелі дае нам сальмяк, вырывае нас з дрымоты. У сваіх кнігах ён паказвае рэальнасць канфлікту, які – як Гераклітӑў агонь, як канфлікт з грэцкіх трагедый – ніколі не згасае. «Заўсёды, колькі

10 Ibid., 201.

стае мне памяцi, – пiсаў ён за год да смерцi, – або вялася вайна, або пра яе гаварылi. Цяпер таксама кажуць, а значыць, неўзабаве яна выбухне, i калi скончыцца, зноў будзе гаварыцца аб гэтым»[11]. Людзi наогул не любяць раптоўных заклiкаў i мабiлiзацыi, яны не хочуць прымаць якi-небудзь з бакоў, яны аддаюць перавагу сну. Вайна здаецца iм, як аўтару прадмовы да польскага выдання «Аб мастацтве вайны», «абстракцыяй», а падрыхтоўка да яе – «чымсьцi лiшнiм»[12]. Макiявелi папярэджвае аб наступствах такога роду духоўнай размякласцi, якая вядзе – пра гэта ён ведаў дакладна – да капiтуляцыi i пагаршэння жыцця ва ўсiх яго сферах. I яшчэ адно: сучасная армiя – армiя наймiтаў, а не патрыётаў, – гэта ў пэўнай ступенi рэгрэс у параўнаннi з тым, што спрабаваў сфармаваць, а потым пiсаць Макiявелi. Сённяшнiя жаўнеры, як кандацьеры Калона, не змогуць памерцi дзеля каштоўнасцей, нiхто, зрэшты, ад iх гэтага не патрабуе. Яны змагаюцца за грошы. I калi яны гiнуць, мы думаем пра сябе: «Уласна мяне гэта не тычыцца» або «так iм i трэба». Лёс вайсковых аддзяленняў, чый баявы дух абапiраецца на плату, а не на каштоўнасцi, нам абыякавы.

11 N. Machiavelli: *Lettere* (527), цыт. па: M. Viroli, *Uśmiech Machiavellego,* Przeł. K. Żaboklicki, Warszawa 2006, 282.

12 B. Baran: Słowo wstępne, in: N. Machiavelli: *O sztuce wojny*, 12.